Бел. тэатр.-маст. ін-т (1955). У 1955—57 акцёр Бел. рэсп. т-ра юнага гледача, у 1960—73 і 1977—81 навук. супрацоўнік Ін-та мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, у 1973—77 нам. міністра культуры Беларусі. Даследаваў дзейнасць Е.Міровіча, тэатр. спадчыну Я.Коласа, развіццё тэатр. маст. аматарства рэспублікі. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускага тэатра» (т. 1—2, 1983—85).

*Тв.:* Народныя тэатры Беларусі. Мн., 1966; Тэатральная самадзейнасць Савецкай Беларусі. Мн., 1972; Якуб Колас і беларускі тэатр. Мн., 1975; Еўсцігней Міровіч. 2 выд. Мн., 1978; Дзіцячы тэатр БССР (1931—1941 гг.). Мн., 1983.

*А.А.Лабовіч.*

**ПЯТРÓЎ** Георгій Мікалаевіч (28.8.1888, Масква — 17.7.1960), піяніст, хормайстар, дырыжор, педагог. Засл. арт. Казахстана (1942). Засл. дз. маст. Беларусі (1949). Скончыў Маскоўскую кансерваторыю (1910). Працаваў у муз. вучылішчах і кансерваторыях Адэсы, Таганрога, Екацярынаслава, Алма-Аты. З 1923 канцэртмайстар хору ў Гомелі, з 1927 выкладчык Мінскага муз. тэхнікума. З 1932 выкладаў у Бел. кансерваторыі. Адзін з арганізатараў і педагогаў Бел. студыі оперы і балета (1930—33). У 1933—37, 1945—50, 1959—60 гал. хормайстар і дырыжор Дзярж. т-ра оперы і балета Беларусі. Кіраваў пастаноўкай балетаў «Чырвоны мак» Р.Гліэра (1933), «Дон Кіхот» Л.Мінкуса (1946) і інш. *В.П.Пракапцова.*

**ПЯТРÓЎ** Міхаіл Уладзіміравіч (н. 23.12.1937, г. Ваўкавыск), акцёр. Нар. арт. Беларусі (1991). Скончыў Бел. тэатр.-маст. ін-т (1960, педагогі К.*Саннікаў*, А.*Бутакоў*). З 1960 працуе ў Бел. рэсп. т-ры юнага гледача. Выканаўца героіка-рамантычных, драм. і камедыйных роляў. Яго творчую манеру вызначаюць дакладнасць распрацоўкі характараў, музыкальнасць, пластычнасць, яркая тэатральнасць і імправізацыя. Лепшыя ролі стварыў у бел. рэпертуары: Ваня («Дзеці аднаго дома» І.Шамякіна), Марат Казей («Марат Казей» В.Зуба), Яўмень («Чаму ж мне не пець, чаму ж не гудзець...» паводле Я.Купалы і М.Чарота), Пан («На ўсіх адна бяда» П.Макаля), дзед Астап («Міколка-паравоз» паводле М.Лынькова), Блазан («Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага), Першы жыхар («Палачанка» А.Дударава), Мікіта Драніца («Плач перапёлкі» І.Чыгрынава ў Бел. т-ры імя Я.Купалы). Сярод інш. роляў: Скід, Феста («Два веронцы», «Дванаццатая ноч» У.Шэкспіра), Труфальдзіна, Брыгела («Зялёная птушка», «Шчаслівыя жабракі» К.Гоцы), Рыф («Вестсайдская гісторыя» А.Лоўрэнса), Стары («Пушкінскія казкі» паводле А.Пушкіна), Артамон («Прыгоды Бураціна» паводле А.Талстога), Круглік («Барабаншчыца» А.Салынскага), Сяргей («Надзея» Г.Радзівонавай), Наглядчык маяка («Два акенцы» Л.Петрушэўскай), Леў («Як выкрадалі Сафі» В.Белшавіцэ), Флімнап («У краіне ліліпутаў» Дж. Свіфта), Мак Донэл («Аперацыя «Дарагі хлопчык» С.Міхалкова), Бабо («Прыйдзе чалавек» Л.Расэба), сеньёр Памідор («Чыпаліна і яго сябры» С.Пракоф'евай і І.Такманава), Сільвер («Востраў скарбаў» Р.Стывенсана), цар Вадакрут («Цар Вадакрут» Я.Шварца), Хобс («Маленькі лорд Фаўнтлерой» паводле Ф.Бернет) і інш. Пас-



*Л.І.***Пятрова.**



*М.У.***Пятроў.**





*М.***Пятроў** *у ролі Брыгелы (злева) і ў ролі Яўменя.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ